Оценка функционального состояния студенток проводилась в апреле 2016 г. и в мае 2019 гг. в ГомГМУ, на базе кафедры физического воспитания и спорта. В данном исследовании принимали участие 100 девушек 1 курса 2016–2017 и 1 курса 2018–2019 учебных годов обучения основного отделения ГомГМУ.

На основе полученных данных после проведения двух исследований по тесту Кверга были отмечены следующие показатели [3].

Так, «отличный» результат индекса Кверга составил 11 девушек на 1 курсе 2016–2017 учебного года и 38 студенток 1 курса 2018–2019 учебного года. Показатель «хороший» составил 7 и 8 девушек соответственно. «Удовлетворительный» результат соответствовал 9 и 16 студенткам на 1 курсах 2016–2017 и 2018–2019 учебных годов. Показатель «неудовлетворительный» значительно улучшился и составил 69 и 38 девушек соответственно (рисунок 1).




**Рисунок 1 — Показатели индекса Кверга у студенток 1 курсов 2016–2017 и 2018–2019 учебных годов ГомГМУ**

***Выводы***

Таким образом, по результатам проведенного исследования можно сделать вывод, что показатели индекса Кверга значительно улучшились. «Отличный» показатель составил 11 % на 1 курсе 2016–2017 учебного года и 38 % студенток на 1 курсе 2018–2019 учебного года, 7 и 8 % девушек соответственно имеют «хороший» показатель, 9 и 16 % студенток соответственно имеют «удовлетворительный» показатель и «неудовлетворительный» показатель индекса Кверга составил 69 и 38 % девушек на 1 курсах 2016–2017 и 2018–2019 учебных годов.

При построении учебных занятий по физической культуре необходимо учитывать полученные данные по тесту Кверга. Как видно по результатам, «неудовлетворительный» показатель значительно снизился, поэтому, для тренировки сердечно-сосудистой системы, в учебные занятия по физической культуре необходимо включать средства и методы, направленные на развитие общей и специальной выносливости, постепенно вводя скоростно-силовые и прыжковые упражнения с обязательным контролем ЧСС до и после выполнения физических нагрузок.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. *Окороков, А. Н.* Диагностика болезней внутренних органов: Диагностика болезней сердца и сосудов / А. Н. Окороков. — М.: Мед. лит., 2002. — С. 20–25.

2. *Новик, Г. В.* Теоретические аспекты физической культуры в высшем учебном заведении: метод. рекомендации: в 4 ч. / Г. В. Новик, Н. В. Карташева, Т. Ф. Геркусова. — Гомель, 2007. — Ч. 2. — С. 14–18.

3. *Минковская, З. Г.* Использование теста Кверга для оценки здоровья, тренированности и функционального состояния сердечно-сосудистой системы / З. Г. Минковская, О. П. Азимок // Актуальные проблемы медицины: сб. науч. ст. Респ. науч.-практ. конф. и 26-я итоговая научная сессия Гомельского государственного медицинского университета, Гомель, 03–04 нояб. 2016 г.: в 4 т. — Гомель: ГомГМУ, 2016. — Т. 3. — С 25–28.

**УДК 78+82-1(476)(098)**

## МУЗЫЧНА-ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ БЕЛАРУСІ (КАРОТКІ ЭКСКУРС У ГІСТОРЫЮ)

***Бароўская І. А.***

Репозиторий ГомГМУ

**Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Уводзіны***

Цяжкія гістарычныя ўмовы фарміравання беларускай народнасці не маглі не запаволіць ходу развіцця яе прафесійнай культуры. Аднак прыродная таленавітасць беларусаў дапамагла ў гэты перыяд стварыць творы непераходзячай каштоўнасці. Немалую ролю ў гэтым адыграла багатая духоўная спадчына, значнае месца ў якой займала музычная народная творчасць Беларусі.

***Мэта***

Даследаваць асноўныя накірункі развіцця музычна-паэтычнай творчасці беларусаў.

***Метады даследвання***

Даследчы, апісальны, аналітычны.

***Вынікі даследвання і іх абмеркаванне***

Унікальным дасягненнем культуры ў мастацкім бытаванні беларусаў у свеце, як вынік працяглага, шматвекавога працэсу развіцця мастацкага слова і музыкі выступае беларуская песенная лірыка. Наша паэзія на працягу амаль стагоддзя заставалася напаўфальклорнай, а таму адной з найбольш сур’ёзных школ паэтычнага майстэрства для яе заставалася народная. Спрыяла гэтаму традыцыйнае бытаванне песні ў дзвюх асноўных разнавіднасцях: народнай і літаратурнай (прафесійнай). Згадаем творчую практыку Яна Чачота, у апошнім томе “Вясковых песень” якога цяжка вызначыць, дзе запісы народных першаўзораў, а дзе аўтарскія песні Яна з-пад Мышы.

Зараджэнне музычна-паэтычнай творчасці беларусаў пачынаецца задоўга да XIX ст., яшчэ ў XII–XIV ст. вызначаецца адзін з самых ранніх помнікаў айчыннага мастацтва — збор харавых і сольных песняспеваў “Хваласпевы ў гонар Еўфрасінні Полацкай”, які быў складзены якраз у час напісання славутага гімна “Багародзіца” — напрацягу XII–XIV ст. і разам працягвалі ўдасканальваца ў XVI–XVII ст.

У нас на Беларусі ёсць цікавы гурт сярэднявечнай беларускай музыкі пад добра вядомай назвай “Стары Ольса” (назва паходзіць ад ручая ў заходняй Магілёўшчыне) пад кіраўніцтвам Зміцера Сасноўскага (нашага земляка), які вырашыў рэканструяваць музычныя традыцыі нашых продкаў часоў Сярэднявечча, калі беларускія землі ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. На думку даследчыкаў, у гэты час быў створаны ўнікальны сінтэз беларускай народнай і прыдворнай музыкі з еўрапейскімі традыцыямі.

У рэпертуар “Стары Ольса” ўваходзяць беларускія народныя балады і ваярскія песні, беларускія народныя танцы, творы беларускіх кампазітараў эпохі Рэнесансу, кампазіцыі з беларускіх зборнікаў прыдворнай музыкі (“Полацкі сшытак”, “Віленскі сшытак”), беларускія канты XVI стагоддзя, а таксама еўрапейскія папулярныя мелодыі эпохі Сярэднявечча і Рэнесансу. Для выканання выкарыстоўваюцца максімальна дакладныя копіі (па выгляду, тэхналогіі, сыравіне) старажытных беларускіх інструментаў — дуды (валынкі), ліры, гусляў, свірэлі,варгана, акурыны, сурмы, берасцяной трубы, барабана. Паколькі гурт выконвае і еўрапейскую музыку, то гучанне ўласна нацыянальных інструментаў значна ўзбагачаецца і мелодыкай агульнаеўрапейскіх сярэднявечных інструментаў — лютняў, флейтаў, мандалін, арабскага барабана. Працэс узнаўлення інструментаў пастаўлены на навуковы ўзровень — гурт супрацоўнічае з музычна-даследчымі цэнтрамі, майстрамі старадаўніх інструментаў.

Адзін з твораў рэпертуара — гімн “Багародзіца”, які ў XV–XVI ст. стаў для палякаў народным гімнам — “песняй Айчыны” (Patrium carmen). Калі, дзе і кім напісаны гэты твор застаецца нявысветленым. Але шмат акалічнасцяў дазваляюць



Рэпазіторый ГомДМУ

выказаць меркаванне, што, як мінімум, тэкст "Багародзіцы" напісаны аўтарам з беларускіх земляў [1, с. 30].

"Багародзіца" мае выразныя аналогіі не толькі са старабеларускай літаратурай, але і з беларускай музычна-паэтычнай творчасцю тых часоў. Зм. Сасноўскі адзначае ідэйнае, вобразнае і нават музычнае падабенства гімна "Багародзіца" са зборнікам "Хваласпевы ў гонар Ефрасінні Полацкай".

У свецкай музыцы XVI–XVIII ст. найбольш характэрным жанрам быў кант: шматгалосая песня свецкага зместу. Разнастайныя па сваёй тэматыцы (філасофскія, павучальныя, пакаяльныя, жартоўныя, лірычныя, сатырычныя), канты набылі шырокае распаўсюджанне на Беларусі, Украіне і Расіі.

Значнае месца ў жыцці насельніцтва Беларусі займала царкоўная музыка. Да нашых часоў захаваліся помнікі праваслаўнай музыкі — "царкоўных гімнаў", ірмалоі XVI–XVIII ст. (Супрасльскі, Віцебскі, Жыровіцкі, Слуцкі, Мірскі і інш.).

Больш за чатыры стагоддзі таму ў Нясвіжскай друкарні быў надрукаваны "Канцыянал" — адзін з першых на Беларусі нотных зборнікаў, які змяшчаў больш за сотню песень (кантаў) з прыкладзенымі да іх нотамі. На Беларусі канты набылі ярка выяўленыя нацыянальныя рысы дзякуючы спалучэнню з традыцыйнай народнай музыкай. Вылучаюць свецкія канты (уласна канты) і рэлігійныя (псалмы). У XVII–XVIII ст. большасць свецкіх кантаў на Беларусі мела любоўна-лірычны змест — пра каханне, сустрэчы, смутак у разлуцы, здраду, супрацьдзеяне бацькоў і інш. Большасць кантаў стваралася на страбеларускай мове з адхіленнямі ў царкоўнаславянскую і польскую. Прагрэсіўная роля Беларусі ў пашырэнні новай дэмакратычнай музычнай плыні невыпадковая: рост гарадоў у XVI ст. спрыяў развіццю разнастайных прафесійных рамёстваў, у тым ліку і музычнага. Таму раней за іншыя краіны Усходняй Еўропы канты набылі папулярнасць менавіта ў беларускіх гарадах. Такі росквіт кантавага жанру паўплываў на тое, што шмат беларускіх паводле мовы і матываў песняў трапіла ў замежныя зборнікі XVIII ст. ("Варшаўскі зборнік", розныя маскоўскія зборнікі).

***Заключэнне***

Музычна-паэтычная творчасць Беларусі пачынае сваё развіццё з XII ст. ў такіх жанрах, як хваласпевы, гімны, канты, ірмалоі. У XVI–XVIII ст. Беларусь была цэнтрам кантавай культуры Ўсходняй Еўропы. Беларуская песенная (прафесійная) лірыка пачынаецца з твораў Яна Чачота. І не толькі таму, што ён адкрыў свету скарбы беларускай народнай песні, але і таму, што менавіта ён сфармуляваў асноўныя законы і прынцыпы, згодна якіх і павінна была з'явіцца і развівацца нацыянальная прафесійная песня: песня як жанр адыгрывае выключную ролю ў фарміраванні менталітэта народа — «самае багатае будзе жніва песень, якія дадуць магчымасць пазнаць іх тонкія, прыгожыя, нават далікатныя і глыбокія пачуцці» [2, с. 171]. Ян Чачот, па сутнасці, вызначыў тыя прыёмы і мастацкія прынцыпы, якія стануць лёсавызначальнымі для прафесійнай песні, бо жыццядзейнасць іх сцвердзіў не толькі як фалькларыст, але і як паэт-практык. І зрабіў усё на высокім эстэтычным узроўні: яго песні зацікавілі і на шмат якія тэксты напісаў музыку славуты беларускі кампазітар Станіслаў Манюшка, "які вярнуўся на Беларусь з думкаю стварыць песні ў народным духу... Таму Чачотавы "Сялянскія песенькі" з'явіліся вельмі дарэчы. Паэт і кампазітар быццам ішлі насустрач адзін аднаму" [3, с.73].

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Сасноўскі, З.* Гісторыя Беларускіх музычных уплываў / З. Сасноўскі. — Мінск: Медысонт, 2009. — 140 с.
2. *Чачот, Я.* Наваградскі замак: Творы / Я. Чачот. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1989. — 320 с.
3. *Скарабагатаў, В.* Зайгралі спадчыны куранты / В. Скарабагатаў. — Мінск: Беларусь, 1998. — 138 с.

**УДК 811.161.1′06′276.6:378-057.875**

## ПРОЦЕСС ОБУЧЕНИЯ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ-МЕДИКОВ УСТНОЙ МОНОЛОГИЧЕСКОЙ РЕЧИ В УЧЕБНО-ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ СФЕРЕ ОБЩЕНИЯ